Ларыса Уладзіміраўна Языковіч

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Ларыса Уладзіміраўна Языковіч (нар. 16 верасня 1954, г. Ганцавічы, Брэсцкая вобласць) — беларускі гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1982). Галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» (з 2010).

Ларыса Уладзіміраўна Языковіч	
Дата нараджэння	16 верасня 1954 (68 гадоў)
Месца нараджэння	Ганцавічы, Ганцавіцкі раён, Брэсцкая вобласць, БССР, СССР
Грамадзянства	Беларусь
Род дзейнасці	гісторык
Навуковая сфера	гісторыя
Месца працы	Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі Інстытут гісторыі НАНБ
Навуковая ступень	кандыдат гістарычных навук (1982)
Альма-матар	БДУ (1977)
Узнагароды	

Біяграфічныя звесткі

Скончыла БДУ (1977). З 1977 у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай АН Беларусі, з 1995 у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя» (з 1996 загадчык рэдакцыі гісторыі Беларусі, з 2003 — гісторыі, філасофіі, эканомікі і права), адначасова ў 1995—2000 у Інстытуце гісторыі.

Навукова-даследчыцкая дзейнасць

Даследуе пытанні міжнароднай дзейнасці Беларусі і яе ўдзел у рабоце спецыялізаваных устаноў ААН, гісторыю беларускай дыяспары ў краінах далёкага і блізкага замежжа, рэлігійна-царкоўнае жыццё беларускай эміграцыі.

Выбраная бібліяграфія

- Удзел БССР у дзейнасці ЮНЕСКА па выкарыстанні сродкаў масавай інфармацыі ў інтарэсах міру // Весці. АН БССР. Сер. грамад. навук. 1980. № 5.
- Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО / Л. В. Языкович. — Мн.: Наука и техника, 1986. — 59, [2] с.
- Рэлігійнае жыццё беларускай эміграцыі // Беларусіка=Albaruthenica. Мн., 1992. Кн. 2;
- Рэлігійны друк і духоўнае жыццё беларускай эміграцыі // Беларусіка=Albaruthenica. 1995. Кн. 5.
- Праваслаўныя беларусы ў грамадска-палітычным жыцці ЗША // Беларусіка=Albaruthenica. 1995. Кн. 5.
- Праваслаўныя беларусы на эміграцыі: Праблемы і ўзаемадачыненні // Беларусіка=Albaruthenica. 1997. Кн. 6, ч. 1.

- Беларуская царква на эміграцыі як захавальніца духоўнай нацыянальнай спадчыны // Славянскія культуры пасля другой сусветнай вайны: Матэрыялы міжкар. навук. канф. Мн., 1996.
- Беларускі рэлігійны друк на эміграцыі як крыніца па гісторыі беларускай дыяспары // Замежная архіўная беларусіка: Матэрыялы міжнар. навук. канф. Мн., 1998.

Узнагароды

- Медаль Францыска Скарыны (3 чэрвеня 2020)[1].

Зноскі

1. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2020 года № 191 «Аб узнагароджанні» (https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32000191&p1=1)

Літаратура

- Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 18. Кн. 1: Дадатак: Шчытнікі — Яя / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. — Мн. : БелЭн, 2004. — Т. 18. Кн. 1. — 472 с. — 10 000 экз. — ISBN 985-11-0035-8. — ISBN 985-11-0295-4 (т. 18. Кн. 1).

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Ларыса_Уладзіміраўна_Языковіч&oldid=3768197"